Сычова С.А.

# Літаратура канца XIX ст.

Пасля паўстання К.Каліноўскага літаратурнае жыццё па-сапраўднаму ажывілася толькі на схіле XIX ст., у 90-я гг. 1870 –80-я гг. былі пераважна часам рэвалюцыйнай публіцыстыкі, рэвалюцыйных думак аб народзе, 90-я гг. пачалі яго мастацкае сцвярджэнне, адлюстраванне. Гэты перыяд мае выключнае значэнне для новай беларускай літаратуры, таму што ён заклаў асновы і прадвызначыў асноўныя рысы яе развіцця ў пачатку XX ст. Вяршыняй развіцця літаратуры парэформеннага саракагоддзя стала творчасць Ф.Багушэвіча, якая аказала непасрэдны ўплыў на першае пакаленне нашаніўцаў. Яго літаратурнымі паплечнікамі становяцца Я.Лучына, А.Гурыновіч, А.Абуховіч, Ф.Тапчэўскі, В.Савіч-Заблоцкі. З сялянскага асяроддзя ў гэты час выйшлі паэты Вільгельм Пратасевіч, Ігнат Мігановіч, Мікалай Марозік (Аляксандр Шункевіч) і інш., ад якіх засталося па аднаму вершу-гутарцы; па-беларуску пішуць Зофья Манькоўская, Станіслаў Гласка і інш. У 1890-я гг. пачалі свой творчы шлях Карусь Каганец, Цётка.

Пасля падаўлення паўстання ў 1870 –80-я гг. беларуская публіцыстыка, ля вытокаў якой стаяў К.Каліноўскі, працягвае развівацца, нягледзячы на рэакцыйную палітыку ўлад. Распачынаюць сваю працу нешматлікія прадстаўнікі беларускага народніцкага руху, якія ішлі ад ліберальна-асветніцкіх пазіцый да распрацоўкі канцэпцыі аўтаномнай Беларусі. У беларускім нацынальна-вызваленчым руху вылучаюцца два накірункі: ліберальны і рэвалюцыйны. У 1870 – 80-я гг. пераважаў ліберальна-асветніцкі напрамак.

У 1881 года пры Пецярбургскім універсітэце ўтварыўся гурток нарадавольцаў «Беларуская грамада»(назва мянялася – «Беларуская арганізацыя», «Гоман»). Гэта арганізацыя распаўсюджвала адозвы да студэнтаў-беларусаў з заклікам працаваць на карысць Бацькаўшчыны.

Захавалася вельмі мала публіцыстычных твораў таго часу, найбольш значнымі з'явамі грамадска-палітычнай думкі сталі зварот «Да беларускай моладзі»(18881), «Пісьмы пра Беларусь»(1882) Д.Баравіка, «Пасланне да землякоў-беларусаў»(1883) Шчырага Беларуса, два нумары часопіса «Гоман»(1884) – усё на рускай мове.

Зварот «Да беларускай моладзі»– тэарэтычнае абгрунтаванне праграмы народнікаў за правы беларусаў. У адозве галоўная ўвага адведзена нацыянальнаму пытанню, аднак не абыдзены і сацыяльныя праблемы. Стваральнікі звароту праводзілі думку аб тым, што Беларусь мае права на развіццё нацыянальнай культуры і павінна стаць раўнапраўным членам славянскай федэрацыі. Адной з галоўных задач аўтары бачылі арганізацыю груп, таварыстваў дэмакратычнага накірунку, вялікую ролю ў асвеце народа адводзілі інтэлігенцыі. У фінале твора гучыць заклік да вялікай працы, вынікам якой павінна стаць мірная рэвалюцыя – такім чынам, аўтары засведчылі сваю ліберальную пазіцыю.

Брашура Данілы Баравіка (калектыўны псеўданім выдаўцоў) «Пісьмы пра Беларусь»у ідэйным плане працягвае адозву «Да беларускай моладзі». Д.Баравік сыходзіцца ў поглядах на метады барацьбы з аўтарамі адозвы: ён таксама робіць упор на асветніцкіх формах пераўтварэння грамадства. Твор пачынаецца прадмовай, у якой выдаўцы паведамлялі пра свой намер надрукаваць «Пісьмы...»па-беларуску, аднак не змаглі зрабіць гэтага з-за нераспрацаванасці тэрміналогіі (палітычнай, філасофскай). Два эпіграфы таксама падкрэсліваюць асветніцкі характар твора: рускі «Доля народа – счастье его. / Свет и свобода прежде всего»(Някрасаў) і беларускі «Загляне сонца і ў наша ваконца».

Аўтары адводзілі вялікую ролю інтэлігенцыі, аднак на той час яна яшчэ не абудзілася да нацыянальнага жыцця, была інертнай і небеларускай па духу. Дваццацігадовае ваеннае становішча пасля паўстання К.Каліноўскага, адсутнасць дэмакратычных інстытутаў, перажыткі феадалізму стваралі цяжкія ўмовы для актыўнай грамадскай працы. Фарміраванне нешматлікіх беларускіх інтэлігентаў адбывалася праз іншыя культуры.

Д.Баравік звяртае ўвагу на беларускае культурнае жыццё, значна менш развітае ў параўнанні з суседзямі: рускімі, фінамі, прыбалтамі. Аўтар піша, што на Беларусі толькі пачынаецца вывучэнне фальклору і этнаграфіі, гаворыць пра існаванне арыгінальных паэтаў (называе В.Дуніна-Марцінкевіча, А.Вярыгу-Дарэўскага). Ён лічыць, што іншая культура ніколі не зможа прыжыцца на беларускай зямлі, бо яна чужая па духу, толькі свабоднае «абласное»жыццё зможа ўзняць народ у духоўным плане.

Асветніцкія задачы Данілы Баравіка аспрэчыў аўтар кнігі «Пасланне да землякоў-беларусаў», які падпісаўся псеўданімам Шчыры Беларус. Па яго перакананні, не асвета, а рэвалюцыйная нацыянальна-вызваленчая барацьба здольная вырашыць актуальныя для беларусаў пытанні – Шчыры Беларус не пагаджаецца з Д.Баравікам у вызначэнні метадаў вырашэння асноўных задач. Вывучэнне свайго краю павінна быць не самамэтным, а стаць падрыхтоўчым этапам дзеля дасягнення вышэйшых ідэалаў.

Для інтэлігенцыі Шчыры Беларус адводзіць ролю агітатараў і прапагандыстаў, уводзіць элементы класавай тэорыі – гаворыць пра раздзяленне грамадства на класы, якія, аднак, павінны ўсе выступіць за палітычнае і эканамічнае адраджэнне краю.

Пытанні, узнятыя ў гэтых творах, знайшлі сваё далейшае асвятленне на старонках праграмна-тэарэтычнага часопіса беларускіх народавольцаў «Гоман». Інтэлігенцыі – роля абудзіць магутныя сілы свайго народа, даць магчымасць праявіць нацыянальны геній, на вышэйшыя пласты грамадства не было спадзявання. У часопісе нацыянальнае і сацыяльнае пытанне не размяжоўвалася, аўтары заклікалі змагацца «ў імя мясцовых інтарэсаў беларускага народа і федэратыўнай аўтаноміі краіны»(№ 1), выступалі за эканамічнае паляпшэнне жыцця.

Працягвае сваё развіццё ананімная літаратура, аднак мяняюцца тэмы і пафас вершаў. У вершы «Хто я?» сцвярджае права селяніна (усё роўна каго: паляка, ліцвіна ці беларуса) звацца чалавекам. Верш «Тэатр» расрывае ўнутраны свет мужыка, які паказаны адначасова і смешным, і трагічным. У

творы расказваецца пра наведванне селянінам тэатра. Ён паводзіць сябе, як дзіця, якое ўбачыла нешта новае. Мужык ацэньвае усё, сыходзячы са свайго жыццёвага вопыта, трапляе ў сме шную сітуацыю, а затым на ноч у турму. Варта адзначыць і сацыяльную крытыку: ён не бачыў белага хлеба, карцар падаўся памяшканнем добрым. Аўтар падкрэслівае, што селянін быў не бедным. Такім чынам, паказваюцца ўмовы жыцця простых людзей.

«Гутарка Паўлюка» ўзнімае праблему спойвання народа як дзяржаўнай палітыкі. Верш «Ноччу ў сяле» — прыклад пейзажнай лірыкі.

Па-асутнасці адзіным у літаратуры другой паловы XIX ст. быў вобраз селяніна. Вобраз гэты меў сваю глыбіню, непаўторныя сродкі і фарбы выяўлення. Пад абалонкай прасцяка, дурня у зацюканым селяніне жыве годны чалавек, які ніколі не страчваў пачуцця самапавагі (вершы «Дурны мужык, як варона»Ф.Багушэвіча, «Стары ляснік»Я.Лучыны, «Імяніннае віншаванне Ігната Сліўкі»І.Мігановіча).

Беларуская літаратура канца XIX ст. была літаратурай розных эстэтычных тэндэнцый, шматкірункавай, мазаічнай. Вылучаецца некалькі асноўных плыняў:

1) народніцкая (Багушэвіч, Абуховіч, Лучын, В.Савіч-Заблоцкі);
2) ліберальна-асветніцкая (А.Ельскі, Мю.Косіч, Ф.Тапчэўскі, З.Тшчакоўская);
3) рэвалюцыйеа-дэмакратычная (А.Гурыновіч);
4) кансерватыўная (А.Пшчолка).

Літаратура:

1.Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX сагоддяў. У 2 т. Т. 2. Новая літаратура : другая палова XVIII—XIX стагоддзе/Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я.Купалы; навук. рэд. тома У.І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 582 с.
2.Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2 ч. Ч. 1 : Падруч. для філал. фак. ВНУ –2 –е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Высш. Шк., 1989. – 39 с.
3. Г а п а в а В.І. Эліза Ажэшка: Жыццё і творчасць. Мн., 1969;
4.Мархель У. Крыніцы памяці. – Мн., 1990. – С. 143 – 176;
5.Кісялёў Г.В. Ад Чачота да Багушэвіча. – Мн., 1993